Нагрувашчванне няшчасцяў, якія часта адбываюцца з людзьмі ў адзін дзень – гэта яшчэ адна важная рыса гратэскава-гіпербалічнай плыні сатырычнай літаратуры. Яна адчуваецца пераважна ў антыкапіталістычных творах пісьменніка «Злачынца пакараны» (1932), «Сцяпанавы дзеці» (1939), «Дарагуся» (1939). Праўда, нягледзячы на дакументалізм гэтых апавяданняў, такое нагрувашчванне здаецца ўсё ж штучным. Толькі ўмоўна выкладзены матэрыял можна лічыць адпавядаючым законам сатырычнага прынцыпу адлюстравання рэчаіснасці. У творах з-за гэтага адчуваецца тэндэнцыйнасць, падпарадкаванне творчасці афіцыйнай ідэалогіі і, магчыма, вера ў прапаганду, што шкодзіць мастацкасці твора, а сатыру ператварае ў звычайнае выкрыццё. Аднак створаныя пісьменнікам карціны ўсё ж вельмі ўражваюць, прымушаюць чытача задумацца над сэнсам жыцця, убачыць зло побач і ў сабе, чым выхоўваюць яго, дапамагаюць удасканаліць розум, зрабіць яго больш дапытлівым, гнуткім, праніклівым.

Такім чынам, відавочна, што спадчына пісьменніка ў 30-я гг. XX ст. становіцца больш песімістычнай, смех – больш жорсткім, з'едлівым. Вельмі актыўна карыстаецца аўтар такімі мастацкімі сродкамі, як перабольшанне, гратэск, падпарадкоўвае ім вобразную сістэму сваіх твораў, насычае апавяданні знішчальнай іроніяй, сарказмам. Адчуваючы тэндэнцыі часу, К. Чорны пачынае свядома адбіраць найбольш вартыя асмяяння і асуджэння факты і, адлюстроўваючы хібы і заганы грамадства, падае адмысловы, сатырычны зрэз рэчаіснасці. Ён прытрымліваецца закону сатырычнага прынцыпу адлюстравання, бо ён найбольш спрыяе змаганню пісьменніка за гуманізм, адстойванню ім у сваёй творчасці агульначалавечых каштоўнасцей.

### Спіс літаратуры


1. *Чорны, К.* Збор твораў: у 8 т. / К. Чорны. – Мінск, 1972. – Т. 2.



*Аксана Данільчык*


## ВАЕННЫЯ РАМАНЫ КУЗЬМЫ ЧОРНАГА Ў КАНТЭКСЦЕ ІТАЛЬЯНСКАЙ ПРОЗЫ

Уключанасць творчасці К. Чорнага ў агульнаеўрапейскі кантэкст падкрэсліў у свой час яшчэ А. Адамовіч: «Ніяк не звужаючы значэння нацыянальнай глебы развіцця, тым больш калі размова ідзе пра такога народнага пісьменніка, як Чорны, можна ўсё ж з упэўненасцю

сказаць, што без свядомага, надзвычай актыўнага засваення сусветнага літаратурнага вопыту не было б і вялікага нацыянальнага майстра Кузьмы Чорнага» [1, с. 5]. Аднак хацелася б звярнуць увагу на той факт, што ў сваіх літаратурна-мастацкіх пошуках К. Чорны не толькі засвойваў зробленае еўрапейскай літаратурай, не толькі рухаўся разам з еўрапейскімі аўтарамі, але часта апярэджваў іх. Гэта відаць і на прыкладзе італьянскай прозы.

Гаворачы пра 40–50-я гг. XX ст., італьянскі крытык Дж. Спаняleці падкрэслівае, што «ў паветры побач з самым жорсткім і агаленым рэалізмам, які паходзіў ад Хэмінгуэя і Фолкнера, вібрыравала і самая значная філасофія стагоддзя, якая прынесла ў літаратуру новыя імёны Сартра і Камю» [14, с. 502]. На гэтым фоне робіцца асабліва заўважнай значнасць твораў К. Чорнага на тэму вайны (раманы «Пошукі будучыні» (1943), «Млечны Шлях» (1944), «Вялікі дзень» (1944), аповесць «Скіп'ёўскі лес» (1944)), якія, на жаль, былі апублікаваныя толькі на пачатку 50-х гг. Як адзначаюць аўтары «Гісторыі культуры Беларусі», «на думку цэнзараў, у іх аўтар ідэалізаваў немцаў, развіваў думку аб іх гуманнасці» [3, с. 380]. Аднак увага да творчых здабыткаў К. Чорнага, у прыватнасці, з боку літаратурнай інтэлігенцыі, абуджаецца амаль адразу пасля вайны, пра што сведчыць факт напісання ў 1946–1948 гг. І. Мележам дысертацыі па творчасці пісьменніка. К. Чорны, які ў адрозненне ад італьянскіх калег не мог актыўна ўдзельнічаць у еўрапейскім літаратурным працэсе (маюцца на ўвазе непасрэдныя творчыя кантакты, пераклады і г. д.), у сваіх мастацкіх пошуках рухаўся ў бок экзістэнцыянальнага спасціжэння быцця. Адметным застаецца і той факт, што раманы К. Чорнага пісаліся непасрэдна ў ваенны перыяд (як, дарэчы, і аповесць А. Камю «Чума», апублікаваная ў 1947 г.), у той час як абсалютная большасць твораў італьянскай і беларускай літаратуры на ваенную тэму напісана ўжо пасля заканчэння вайны.

У першыя пасляваенныя гады галоўным накірункам італьянскай літаратуры стаў неарэалізм, аднак многія творы можна аднесці да яго з пэўнымі агаворкамі: яны вызначаюцца разнастайнасцю мастацка-выяўленчых сродкаў і шматпланавасцю вобразаў, напрыклад, раман «Сцяжынка павучыных гнёздаў» (1948) І. Кальвіна спалучае рэальнае і фантастычнае, а раман «Людзі і нелюдзі» (1945) Э. Віттарыні нясе рысы мадэрнісцкіх плыней. І амаль адразу ў творах італьянскай літаратуры ўзнімаецца тэма чалавека і яго якасцей, напрыклад, у самой назве рамана П. Леві «Ці гэта чалавек?» (1947) пастаўлена пытанне, якое можна лічыць цэнтральным ва ўсёй ваеннай про-

зе. Вырашэнне гэтай праблемы П. Леві, Э. Віттарыні, К. Чорным і другімі пісьменнікамі ўзыходзіць да традыцыі Ф. Дастаеўскага: аўтары раскрываюць складаны і неадназначны свет чалавечай асобы, у якім ёсць месца і вечным каштоўнасцям, і нізкім памкненням.

Амаль усе ваенныя творы К. Чорнага пачынаюцца не з вайны, а з часоў, якія ёй папярэднічалі, ці са своеасаблівых уводзін, увасабляючы на практыцы думку А. Камю: «Людзі ўсё хацелі зразумець, дзе вайна – і што ў ёй мярзотнага. І вось яны заўважаюць, што ведаюць, дзе яна, што яна ў іх саміх, што яна ў гэтай нязручнасці, у гэтай неабходнасці выбіраць, якая прымушае іх ісці на фронт і пры гэтым пакутваць, што не хапіла духу застацца дома, або застацца дома і пры гэтым пакутваць, што яны не пайшлі на смерць разам з іншымі. Вось яна, яна тут, а мы шукалі яе ў сінім небе і ў абыякавым акаляючым свеце. Яна ў страшэннай самоце таго, хто змагаецца, і таго, хто застаецца ў тыле, у ганебным адчаі, які ахапіў усіх, і ў маральным падзенні, якое з часам праступае на тварах. Надышло царства звяроў» [2, с. 283]. І чалавек у творах К. Чорнага супрацьстаіць гэтаму царству, вырашаючы праблему ўласцівага і неўласцівага, прычым людзі ў творах беларускага пісьменніка жывуць (існуюць) і перажываюць гэты час, асэнсоўваючы яго па-філасофску. Гэта падкрэслівае і сам аўтар: «Беларускі народ ідзе цяпер праз новы рубеж свае гісторыі. З таго моманту, які мы сёння перажываем, астанецца навекі новы гістарычны вопыт нашага народа, таксама як астануцца навекі сляды той крывавай драмы, якая разыгралася сёння на беларускай зямлі. Набытыя ў жорсткай практыцы вялікага змагання з нямецкім захопнікам, з ненавісным чужаземным прышэльцам на нашу зямлю, новыя рысы ўдасканаляць наша аблічча, узбагацяць нас новымі якасцямі» [4, с. 442]. Безумоўна, К. Чорны меў на ўвазе такія станоўчыя якасці, як мужнасць, высакароднасць, самаахвярнасць, але суровая праўда ваенных часоў прымушала яго спыняцца і на іншых, зусім не высакародных якасцях чалавека.

Вызначэнне характэрнага і нехарактэрнага чалавеку адбываецца і ў лепшых творах італьянскай літаратуры. Э. Віттарыні ў рамане «Людзі і нелюдзі» спрабуе зразумець, ці сапраўды ў чалавеку столькі непатрэбнай жорсткасці: «Я б хацеў пабачыць іншых: самога Гітлера... Ці любога з немцаў Гітлера, з вайскоўцаў Мусаліні, з усіх, хто нарабіў спраў усяму свету... хто смяяўся з таго, што рабіў, а цяпер бы ўцёк пад ложак скуголіць... Але мы хочам ведаць іншае. Не тое, ці ўласціва чалавеку скуголіць, а ці ўласціва чалавеку рабіць тое, што робяць яны, калі крыўдзяць іншых» [15, p. 163]. (Дарэчы, П. Леві адзін з раздзелаў сваёй апошняй кнігі «Тапельцы і ўратаваныя» (1986) на-

заве «Непатрэбная жорсткасць»). Трэба сказаць, што пытанне пра наяўнасць жывёльных інстынктаў у чалавечай істоце разглядалася і філасофіяй. Напрыклад, Б. Спіноза лічыў чалавека часткай прыроды, якую атаясамліваў з Богам, і сцвярджаў, што ўсе яго дзеянні абумоўлены універсальнымі сусветнымі прычынамі, сярод якіх – прага чалавека да самазахавання.

К. Чорны ўздымае пытанне, ці ўласціва чалавеку ўвогуле шукаць вайны і знаходзіцца на вайне, якая, як вядома, самазахаванню не спрыяе: «У нашы дні спрабавала забытаваць пропаведзь, што кожны народ любіць вайну. Горкая практыка паказала, што ваяўнічае геройства народа нараджаецца і выпрацоўваецца не ад замілавання да рэк крыві на полі вайны, а ад неабходнасці сцерці з твару зямлі такую погань, якая ў нашы дні ў вобразе Гітлера заявіла, што нармальны стан мужчыны вечна быць у вайне» [5, с. 46]. На хрэстаматыйна вядомых старонках, прысвечаных чалавечаму сэрцу, беларускі пісьменнік сцвярджае гуманістычны ідэал чалавека, прасякнуты магутнай верай у яго духоўны пачатак: «...Чалавек не вытрымае, каб вечна быць зверам...» [5, с. 116]. Наяўнасць душы і Бога ў душы становіцца кульмінацыяй думкі Э. Віттарыні аб чалавеку: «Мы гаворым, што гэта ўласціва чалавеку. Мець у сваёй душы Бога ў роспачы... А таксама мець у душы Бога шчаслівага. Быць мужчынам і жанчынай. Быць маці і дзецём. Усё гэта мы зведалі і можам сказаць, што гэта ўласціва нам» [15, р. 167]. Аднак вайна, як лічыць А. Камю, робіць умовы чалавечага існавання непрыдатнымі для захавання душы і сэрца: «Быць створаным, каб самому ствараць, любіць і перамагаць, – значыць быць створаным, каб жыць у міры. Але вайна вучыць нас праігрываць і рабіцца тым, чым мы не былі» [2, с. 283].

Героі К. Чорнага вымушаны – і гэта асабліва падкрэслівае аўтар, распавядаючы гісторыю амаль кожнага персанажа – мяняць свой лад жыцця, прыстасоўвацца да новых умоў. Аднак для беларускага пісьменніка і немцы, і беларусы – гэта, у першую чаргу, людзі, што так ці інакш апынуліся ўцягнутымі ў вір Другой сусветнай вайны. Яны маюць сваю гісторыю, як Адам Блецька ці Густаў Шрэдэр, і гэтая акалічнасць вельмі важная, яна адрознівае раманы К. Чорнага ад твораў іншых аўтараў (у дадзеным выпадку не толькі беларускай літаратуры). Адносіны паміж ворагамі ў К. Чорнага – перш за ўсё адносіны паміж людзьмі, пры гэтым пісьменнік паказвае дэградацыю адных і высакароднасць другіх. Паступова ў творчасці беларускіх і італьянскіх пісьменнікаў гэтыя прынцыпы выйдуць на першае месца, што асабліва выразна выявіцца ў 90-я гг. XX ст.

Цікавай з гэтага пункту гледжання з'яўляецца эвалюцыя, якая адбылася ў светапоглядзе Нута Рэвэллі, удзельніка вайны, аўтара аўтабіяграфічнай кнігі «Ніколі не позна» (1946). Адносіны Н. Рэвэллі да немцаў мяняюцца з цягам часу. Так, пісьменнік згадвае, што пасля вяртання з рускага фронту ён «...настолькі ненавідзеў немцаў, што дастаткова было глянуць на іх, як кроў стукала ў скроні. Я лічыў іх адзінымі вінаватымі ў нашай бядзе» [11, p. 75]. Аднак мінула пяцьдзесят гадоў, і вастрыня пачуццяў змяняецца памяркоўнасцю, якая не азначае, што ўсё забыта: «Немцы... Многія былі вымушаны быць жорсткімі, павінны былі выконваць загады. Сёння ў мяне няма больш нянавісці. Але я ім не дарую» [11, p. 111]. Тым не менш у кнізе «Прапаўшы без звестак з Марбургу» (1993) ён узнаўляе гісторыю аднаго нямецкага афіцэра, забітага партызанамі, і хоць у выніку вобраз «самотнага конніка», што лашчыць дзяцей і ў вольны час іграе Баха, развейваецца як дым, даследаванне, здзейсненае аўтарам, – вельмі важны крок. Крытык Гафрэда Фофі адзначаў: «Магчымасць надаць Ворагу асабісты твар і акрэсліць яго індывідуальныя фізічныя і маральныя асаблівасці, што не адпавядаюць дадзенаму вобразу, робіцца фундаментальным, катарсічным крокам, каб пэўным чынам вярнуць чалавечнасць нам самім» [9, p. 14]. На нашую думку, веліч К. Чорнага ў тым, што ён з самага пачатку ішоў гэтым шляхам. У дзённіку ён запісаў: «У вялікай літаратуры персанажы маюць сваю біяграфію. А каб пісаць біяграфіі людзей, трэба ведаць, што народ – гэта мільёны індывідуальнасцей, кожны са сваім індывідуальным аблічам і лёсам, хоць і падначаленымі аднаму закону жыцця – нацыянальнаму і дзяржаўнаму» [6, с. 588]. Пісьменнік тут не мае на ўвазе немцаў, але распаўсюджвае гэтыя прынцыпы і на стварэнне іх вобразаў, надзяляючы пэўнымі рысамі характару, як у рамане «Млечны шлях»: «Ён плакаў. Што такое здарылася? Адкуль гэта ў такі час, калі спарахнелыя ў зямлі лаціняне ніколі яшчэ не мелі такога бліскучага апраўдання сваёй прымаўцы: «чалавек чалавеку воўк». І ніхто гэтаму не здзівіўся і як бы не заўважыў нават гэтага здарэння» [6, с. 192].

Тут можна згадаць раман М. Рыгоні-Стэрна «Сяржант сярод снягоў» (1953), створаны на дакументальнай аснове і цікавы ў першую чаргу тым, што адмаўляе вайну як спосаб існавання чалавека і сцвярджае гуманістычныя адносіны паміж людзьмі. Гэта выявілася на хрэстаматыйна вядомых у Італіі старонках, прысвечаных сустрэчы галоўнага героя з савецкімі салдатамі ў адной з казацкіх станіц: «Яны ўзброеныя. З чырвонай зоркай на пілотцы!.. Я гляджу на іх скамянела. Яны сядзяць за сталом... І глядзяць на мяне, спыніўшы лыжкі ў паветры. –

Mnie khocetsia iestj, – кажу. Там ёсць і жанчыны. Адна бярэ міску, напаўняе яе... з агульнай супніцы, і падае мне. Я раблю крок наперад, закідваю ружжо за плечы і ем. Часу больш не існуе... – *Spaziba*, – кажу, пасля таго, як скончыў... Рускія салдаты глядзяць нерухома, як я выходжу» [12, р. 132]. Разважаючы наконт таго, што адбылося, аўтар прыходзіць да высновы: «Гэта было вельмі проста. Рускія былі такімі, як я, я адчуваў гэта. У той хаце стварылася паміж мною і рускімі салдатамі, жанчынамі і дзецьмі гармонія, якая не была перамірыем... Аднойчы абставіны прывялі да таго, што людзі засталіся людзьмі... Калі гэта здарылася адзін раз, то можа здарыцца ізноў. Можа здарыцца, я хачу сказаць, з безліччу іншых людзей і стаць звычайным спосабам існавання» [12, р. 133]. Тэма паразумення чалавека з іншымі людзьмі тут выходзіць за межы пэўнай супольнасці і распаўсюджваецца на ўсё чалавецтва ў цэлым, нават на ворагаў, якімі пад час вайны былі італьянцы для савецкіх салдат і наадварот.

Для другога італьянскага аўтара Ч. Павэзэ мёртвыя фашысты і мёртвыя партызаны («Перш, чым праспявае певень» (1949)) – гэта толькі забітыя людзі: «Ты атрымліваеш уражанне, што той самы лёс, які памясціў на зямлю гэтыя целы, спыніў нас, быццам скамянелых, каб глядзець на іх на ўсе вочы. І гэта не страх, гэта не звычайная баязлівасць. Ты адчуваеш сябе прыніжаным, таму што разумееш – намацваеш вачыма, – што на месцы мерцвяка маглі б быць мы: і не было б ніякай розніцы, і тым, што мы яшчэ жывыя, мы абавязаны гэтаму сцятаму целу» [12, р. 138]. Смерць памірыла тых, хто быў ворагам пры жыцці.

Адна з вяршынь італьянскай прозы на тэму вайны – раман П. Леві «Ці гэта чалавек?» (1947). Лёс гэтай кнігі падобны да лёсу твораў К. Чорнага: у 40-я гг. яна не была зразуметай і не атрымала належнай увагі, толькі ў 1956 г. пасля выставы ў г. Турыне, прысвечанай дэпартацыі яўрэяў, кнігу перавыдалі, і з таго часу ўвага да яе не змяншаецца. Як і К. Чорны, П. Леві на прыкладзе трагедыі свайго народа ўздымае агульначалавечыя праблемы; найбольш часта ў кнізе сустракаюцца словы адмаўленне, адчужэнне, знішчэнне. Безумоўна, нацысцкая машына была наладжана такім чынам, каб адасобіць чалавека, адгарадзіць яго ад іншых, а пасля знішчыць маральна і фізічна. Самай страшнай праявай нацызму стаў лагер. Гэтую тэму закрануў К. Чорны на старонках рамана «Пошукі будучыні»: «...яна не бачыла таго страшнага малюнка, калі чалавек, загнаны ў няволю, у загарадзь і ў натоўп сабе падобных няшчасных, ад якіх забрана права, самае першапачатковае, патрэбнае нават і некаторым жывёлінам – дзеля сваіх прыродных патрэб пабыць часам у адзіноце – яна не на-

глядала, як чалавек тут ператварыўся ў жывёліну, а натоўп у чараду. Каля вядра з баландай людзі збівалі адзін аднаго з ног, ратуючыся ад галоднай смерці і хваробы. Тыя ж, што былі цвярдзейшыя воляй, угаворвалі гэтых і словам і крыкам наладзіць сталасць» [5, с. 139]. Немагчыма не адзначыць глыбіню творчай асобы К. Чорнага – беларускі пісьменнік не быў непасрэдным сведкам таго, пра што ён піша (мог толькі ведаць пра тое, што адбывалася ў лагерах НКУС), тым не менш ён звярнуў увагу на самыя, бадай, балючыя моманты існавання чалавека ў падобных абставінах: людзі, якія траплялі ў лагер, быццам бы апыналіся па-за мяжой чалавецтва. Гэта датычылася і вязняў, і катаў. П. Леві ставіцца са шкадаваннем і да адных і да другіх: «Персанажы гэтых старонак не ёсць людзі: іх чалавечнасць была пахавана, альбо яны пахавалі яе пад крыўдай, перанесенай самімі ці нанесенай іншым. ...Усе прыступкі нездаровай іерархіі, створанай немцамі неверагодным чынам, сабраліся ў адзіным унутраным адчаі» [10, p. 103].

Паказальны ў гэтым плане раздзел «Песня Уліса», дзе неўміручы твор Дантэ «Боская камедыя», пра які П. Леві распавядае свайму французскаму сябру Жану, дазваляе палонным ізноў адчуць сябе людзьмі: «...абсалютна неабходна і неадкладна, каб ён слухаў, каб зразумеў гэтае «come altrui piaque», перш чым стане занадта позна, заўтра ён альбо я можам памерці і ніколі больш не ўбачыцца, я павінен сказаць яму, растлумачыць пра сярэднявечча, пра такі чалавечны і неабходны, і тым не менш нечаканы анахранізм, і яшчэ іншае, нешта гіганцкае, што я сам убачыў толькі зараз...» [10, p. 103]. Калі вакол увесь свет здаецца варожым і не даводзіцца чакаць спагады ад тых, хто побач, чалавек шукае дапамогі і падтрымкі ў мастацтве, бо само мастацтва і яго ўспрыманне застаецца чыста індывідуальным дзеяннем, у якім чалавек выяўляецца як асоба і, нягледзячы на ўсе спробы ніверліравацца, захоўвае свае асабістыя характарыстыкі.

Зварот да Вечнага, да духоўнасці неаднаразова адбываецца на старонках рамана К. Чорнага «Млечны Шлях». Сімвалам духоўнасці выступае зорнае неба, да якога скіраваны погляды герояў у розныя моманты іх жыцця: «Млечны Шлях! – моцна сказала Ганульса, павярнуўшыся да акна. – За дзень да вайны, калі мы яшчэ і не думалі, што яна будзе, мы з Марынай цэлую ноч прастаялі на балконе і глядзелі на Млечны Шлях. Гэтая зорная дарога так вабіла кудысьці нас!...» [7, с. 217]. Менавіта зорнае неба можа паяднаць людзей: «Я быў на вашай зямлі ў тую вайну. Мы канчалі вайну пацалункам... Над маім домам у Германіі гэты самы стаіць Млечны Шлях... Не пакіньце мяне!» [7,

с. 219]. У рамане «Вялікі дзень» К. Чорны звяртаецца і да іншай крыніцы вечных каштоўнасцей – да Бібліі, да ўзаемаадносін веры і чалавека, распавядаючы пра выпрабаванне Іова: «Ён ведаў, што гэта бог яго карае, але не пакінуў маліцца богу, і хваліў бога, і не ўзняў слова на бога. Бог за гэта вярнуў яму ўсё: і здароўе, і сілу, і маёмасць, ...і дзеці ў яго другія нарадзіліся... І гэта ж тысячы год гаворыцца людзям, і няўжо ніхто не падумаў ні разу, што не можна так гаварыць чалавеку, бо гэта вялікая няпраўда» [8, с. 378]. У такім жа палемічным ключы разважае на тэму Бога і веры П. Леві, згадваючы апошнія дні ў лагеры: «Сёння я думаю, што ўжо з-за аднаго факту існавання Асвенцыму ніхто ў наш час не павінен гаварыць пра Божы Провід: аднак праўда таксама, што тады згадка пра біблейскія збавенні ў найгоршых бедствах пранеслася ветрам у нашых душах» [10, р. 140].

Для герояў К. Чорнага адмаўленне чалавечнасці з'яўляецца найвялікшай пакутай: «Душа мая гнала вон усялякае спачуванне. Гэта была новая мая пакута: бачыць чалавека перад пагібеллю і ў няшчасці і не мець сілы выйсці з чэрствасці і халоднасці!» [7, с. 211]. Прычым шлях ад чалавека да істоты, якая проста жыве, дыхае, есць і спіць, не такі складаны, як шлях адваротны. Апошняя частка рамана П. Леві «Гісторыя дзесяці дзён» распавядае пра паступовае вяртанне пакінутых у спусцелым лагеры вязняў да нармальных чалавечых стасункаў. Упершыню за доўгі час адны вязні падзяліліся хлебам з другімі, і гэта, на думку аўтара, быў першы чалавечы жэст: «Усяго за дзень да гэтага падобная падзея не магла б здарыцца. Лагерны закон казаў: «Еш сам хлеб свой і, калі зможаш, хлеб свайго суседа» і не пакідай месца для ўдзячнасці. Гэта азначала, што лагер перастаў існаваць» [10, р. 142]. Аднак лагер, які перастаў існаваць як матэрыяльная рэальнасць, назаўсёды застаўся страшным прывідам, які будзе ўсё жыццё пераследаваць П. Леві.

Чалавек варты таго, каб умовы яго існавання не перашкаджалі, а спрыялі раскрыццю лепшых якасцей. Гэтую думку сцвярджаюць сваімі творамі К. Чорны, А. Камю, П. Леві, Э. Віттарыні, Ч. Павэзэ і многія другія пісьменнікі. Хацелася б падкрэсліць і такую якасць твораў К. Чорнага, як лакалізаванасць падзей: яны падаюцца вачыма не проста беларусаў, але вачыма жыхароў пэўнай мясцовасці. І гэта яднае беларускага празаіка з італьянскімі: для італьянскай літаратуры прывязка аўтара да канкрэтнай мясцовасці адна з самых характэрных, гістарычна абумоўленых з'яў.

Напрыканцы хацелася б ізноў згадаць А. Камю: «Я спрабаваў паказаць... паўсядзённае суіснаванне людзей і гісторыі, праліць як мага

больш святла на нашае звычайнае жыццё і ўпартую барацьбу людзей супраць дэградацыі – сваёй і іншых» [2, с. 138]. Гэтыя словы цалкам стасуюцца з творчасцю К. Чорнага, які не толькі раскрываў складаны ўнутраны свет чалавека ў сваіх раманах, але ў крытычных артыкулах называў беларускую літаратуру «вялікай», даючы нам магчымасць зусім па-іншаму ўбачыць і літаратурны працэс, і нас саміх.

## Спіс літаратуры


1. *Адамовіч, А.* Маштабнасць прозы / А. Адамовіч. – Мінск, 1972.
2. *Камю, А.* Творчество и свобода: сборник / А. Камю. – М., 1990.
3. *Лыч, Л.* Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мінск, 1997.
4. *Чорны, К.* Беларуская проза і драматургія часу Айчыннай вайны / К. Чорны // Збор твораў: у 6 т. / К. Чорны. – Мінск, 1955. – Т. 6.
5. *Чорны, К.* Пошукі будучыні / К. Чорны // Збор твораў: у 8 т. / К. Чорны. – Мінск, 1974. – Т. 6.
6. *Чорны, К.* Выбраныя творы / К. Чорны. – Мінск, 2000.
7. *Чорны, К.* Млечны шлях / К. Чорны // Збор твораў: у 8 т. / К. Чорны. – Мінск, 1974. – Т. 6.
8. *Чорны, К.* Вялікі дзень // Збор твораў: у 8 т. / К. Чорны. – Мінск, 1974. – Т. 6.
9. *Fofi, G.* Il nemico ritrovato / G. Fofi // Revelli N. Il disperso di Marburg. – Marburg, 1995.
10. *Levi, P.* Se questo й un uomo. La tregua / P. Levi. – Torino, 1997.
11. *Revelli, N.* Il disperso di Marburg / N. Revelli.– Torino, 1997.
12. *Rigoni Stern, M.* Il sergente nella neve. Ritorno sul Don / M. Rigoni Stern. – Torino, 1997.
13. *Salinari, C.* Storia della letteratura italiana con antologia degli scrittori e dei critici: 3 vol. / C. Salinari, C. Ricci. – Roma, 1985. – Vol. 3: L'Ottocento e il Novecento.
14. *Spagnoletti, G.* Storia della letteratura italiana del novecento / G. Spagnoletti. – Roma, 1994.
15. *Vittorini, E.* Uomini e no / E. Vittorini. – Milano, 1965.



*Тамара Тарасава*


# ІДЭЯ САМАКАШТОЎНАСЦІ ЧАЛАВЕКА Ў ТВОРАХ МІХАСЯ ЗАРЭЦКАГА ПРА КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ

Беларуская літаратура надзвычай адчувальная да духоўных аспектаў сацыяльна-палітычных праблем грамадства. Не была выключэннем і творчасць М. Зарэцкага. Ён пісаў і пра рэвалюцыю («Сцежкі-дарожкі»), і пра новую вёску («Падарожжа на новую зямлю»), і пра трагічныя лёсы прадстаўнікоў былога класа эксплуататара-